■ Спорт-тайм

# На шляху да вяртання

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра тое, што самая тытулаваная біятланістка краіны Дар'я Домрачава прыступіла да трэніровак, пра чарговую перамогу гандбольнага БГК імя Мяшкова і «чорную» паласу хакейнага «Дынама»**



**1. Трохразовая алімпійская чэмпіёнка па біятлоне Дар'я Домрачава пачала трэніроўкі пасля чатырох тыдняў пасля нараджэння дзіцяці.** Нагадаем, дачка Домрачавай і Б'ёрндалена — Ксенія з'явілася на свет 1 кастрычніка.

Пакуль Дар'я трэніруецца ў Раўбічах, пра гэта яна паведаміла на сваіх старонках у сацсетках. Адзначым, раней спартсменка ўжо заяўляла, што плануе прыйсці ў форму да чэмпіянату свету ў Хохфільцэне, які пачнецца 9 лютага 2017 года.

**2. БГК імя Мяшкова ў рамках SEHA-лігі ў Брэсце абыграў «Гарэнне» з славенскага Веленье — 26:24.**

Нагадаем, з 1 па 6 лістапада ў міжнародным гандбольным календары наступае паўза. У гэты час зборная Беларусі ў рамках кваліфікацыі чэмпіянату Еўропы 2 лістапада прыме ў Мінску зборную Румыніі, а 6 лістапада ў Нішы згуляе з сербамі.

**3. Завяршыліся ўсе матчы 27-га тура чэмпіянату краіны па футболе ў вышэйшай лізе.** У Мінску «Крумкачы» з вялікім лікам саступілі БАТЭ — 0:3. «Нафтан» на сваім полі мінімальна перайграў брэсцкае «Дынама» — 1:0. «Граніт» саступіў «Віцебску» — 0:3, а мінскае «Дынама» перайграла «Белшыну» — 3:1. Гэта, дарэчы, ужо дзясятая перамога сталічнага клуба запар. Салігорскі «Шахцёр» перайграў гродзенскі «Нёман» — 1:0. У нядзелю «Мінск» у гасцях абыграў «Слуцк» — 1:0, а «Гарадзея» і «Іслач» згулялі ўнічыю — 0:0. «Тарпеда»-БелАЗ перайграў «Славію» — 2:0.

**4. Хакеісты мінскага «Дынама» з вялікім лікам саступілі ў гасцях «Віцязю» — 6:9.** Каманда Крэйга Вудкрафта пацярпела другое выязное паражэнне запар і дзясятае ў сезоне.

*— Гэта быў вялікі матч для нас. Пасля гульні з «Лакаматывам» мы хацелі атрымаць станоўчы імпульс ад гэтай сустрэчы, хацелі паказаць добрую гульню на працягу ўсіх 60 хвілін сустрэчы. Ведалі, што матч будзе праходзіць у сілавым стылі. Мы выглядалі вельмі блякла ў першыя хвіліны. Нашай камандзе трэба зразумець, што мы не можам даваць сапернiку перавагу і думаць, што ўсё завяршыцца на нашу карысць. Калі ты хочаш перамагаць — трэба навучыцца гуляць у абароне. У апошні час у нас гэта не вельмі атрымліваецца, таму мы не можам дамагчыся неабходнага выніку,* — сказаў пасля матча **галоўны трэнер «Зуброў» Крэйг Вудкрафт.**



Пасля 24 праведзеных гульняў, набраўшы 40 ачкоў, мінчане займаюць сёмае месца ў турнірнай табліцы Заходняй канферэнцыі. Чарговы матч у Кантынентальнай хакейнай лізе «Дынама» правядзе сёння на выездзе з аднаклубнікамі з Рыгі.

**5. Баскетбалісты «Цмокі-Мінск» пасля дзвюх перамог запар у Адзінай лізе ВТБ пацярпелі паражэнне ў Казані ад УНІКСа — 71:98.**

Такім чынам, баскетбалісты «Цмокі-Мінск» у чатырох паядынках двойчы перамаглі і двойчы саступалі сапернікам. Набраўшы 6 ачкоў, падапечныя Ігара Грышчука займаюць 7-е месца сярод 12 удзельнікаў «банкаўскага» турніру. Свой наступны матч мінчане ў Адзінай лізе ВТБ правядуць 6 лістапада ў гасцях у рыжскага ВЭФа, які з трох гульняў перамог толькі ў адной.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.10 | 17.35 | 9.25 |
| Віцебск — | 8.04 | 17.21 | 9.17 |
| Магілёў — | 8.01 | 17.25 | 9.24 |
| Гомель — | 7.53 | 17.26 | 9.33 |
| Гродна — | 8.25 | 17.51 | 9.26 |
| Брэст — | 8.21 | 17.56 | 9.35 |

## Месяц

*Маладзік 30.10—06.11.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

*Пр. Івана, Сяргея.*
*К. Усіх святых.*



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

# ЗАЎТРА




■ Чулі?!

# НАШ МАЗ НА ЧЭМПІЯНАЦЕ СВЕТУ

## Мінскі аўтазавод выпусціў новы экалагічны аўтобус з палепшанымі характарыстыкамі

**Чакаецца, што менавіта ён будзе развозіць гасцей і балельшчыкаў чэмпіянату свету па футболе 2018 года ў Расіі. Навінку ўпершыню прадставілі ў Маскве на міжнародным аўтобусным салоне Busworld Russia 2016.**



У навінцы знайшлі адлюстраванне амаль усе сусветныя тэндэнцыі ў сферы пасажырскай аўтатэхнікі. Асаблівасць аўтобуса — высокая экалагічнасць: інжынеры абсталявалі яго рухавіком Mercedes класа Еўра-5 і механічнай каробкай перадач ZF, больш эфектыўнай, чым «аўтаматыка», на прыгарадных і міжгародніх маршрутах. У экстэр'еры аўтобуса выкарыстаны святлодыёды, каб дабіцца лепшага асвятлення пры меншым спажыванні энергіі. Дзякуючы асаблівай канструкцыі яны таксама абаронены ад пылу і вільгаці.

У салоне можа быць як 49, так і 51 камфартабельнае сядзенне. Кожны аўтобус абсталяваны пандусамі для людзей з інваліднасцю.

«Па сваіх характарыстыках навінка апераджае шматлікія аўтобусы, якія цяпер перавозяць людзей у еўрапейскіх гарадах. Сучасны дызайн, камплектуючыя вядучых вытворцаў і канструкцыя павышанай надзейнасці робяць аўтобус ідэальным для дастаўкі гасцей і балельшчыкаў чэмпіянату свету па футболе», — перакананыя стваральнікі новай машыны.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

### Неспрыяльныя дні і гадзіны ў лістападзе

| | |
|---|---|
| **1, аўторак,** *5.00 — 16.30* | **17, чацвер,** *0.00 — 3.00* |
| **3, чацвер,** *13.30 — 24.00* | **18, пятніца,** *22.30 — 24.00* |
| **4, пятніца,** *0.00 — 5.00* | **19, субота,** *0.00 — 5.30* |
| **6, нядзеля,** *12.00 — 16.00* | **21, панядзелак,** *10.30 — 12.00* |
| **8, аўторак,** *16.30 — 23.00* | **22, аўторак,** *19.30 — 24.00* |
| **11, пятніца,** *0.00 — 4.00* | **23, серада,** *0.00 — 21.30* |
| **12, субота,** *15.30 — 24.00* | **25, пятніца,** *16.00 — 24.00* |
| **13, нядзеля,** *0.00 — 4.30* | **26, субота,** *0.00 — 10.30* |
| **14, панядзелак,** *16.00 — 24.00* | **27, нядзеля,** *23.00 — 24.00* |
| **15, аўторак,** *0.00 — 3.30* | **28, панядзелак,** *0.00 — 21.30* |
| **16, серада,** *13.00 — 24.00* | |

Даты | Падзеі | Людзі

### 1 ЛІСТАПАДА

**1541** год — 475 гадоў з дня нараджэння Джавані Марыі Бернардоні, італьянскага архітэктара. Прадстаўнік барока. У 1583-1599 гадах па запрашэнні князя М.К. Радзівіла Сіроткі працаваў у Нясвіжы. Браў удзел у першым этапе ўзвядзення Нясвіжскага палацава-паркавага комплексу. Аўтар праекта і кіраўнік будаўніцтва комплексу Нясвіжскага касцёла езуітаў і будынка калегіума. Пабудаваў таксама касцёлы ў Гродне і Клецку. У ВКЛ і Рэчы Паспалітай паклаў пачатак архітэктурна-будаўнічай практыцы на аснове праектных чарцяжоў. Аўтар так званага Альбома Бернардоні — архіўнай калекцыі графічных матэрыялаў XVI ст. з Нясвіжа. Памёр у 1605 годзе.



**1899** год — на ваду спушчаны крэйсер «Вараг» — легенда рускага флоту. Ён быў пабудаваны на суднабудаўнічай верфі «Уільям Крамп і сыны» ў Філадэльфіі (ЗША) па заказе расійскага ўрада.

**1902** год — нарадзіўся Нурдаль Грыг, нарвежскі пісьменнік, паэт, драматург. Яго лепшы раман «Свет яшчэ павінен стаць маладым», які выйшаў у 1939 годзе, стварыўся пад уражаннем ад маскоўскіх судовых працэсаў і ўдзелу у грамадзянскай вайне ў Іспаніі. У 1940 годзе Грыг вяяваў супраць нямецкіх акупантаў, увайшоў у нарвежскі ўрад у Лондане, напісаў выдатныя цыклы вершаў, якія прысвяціў духу Супраціўлення. Пісьменнік загінуў 2 снежня 1943 года, выконваючы журналісцкае заданне, у збітым над Берлінам бамбардзіроўшчыку.

**1921** год — 95 гадоў таму заснаваны Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт. Заснаваны як факультэт Белдзяржуніверсітэта, з 1930 года — Мінскі медыцынскі інстытут, з 2001-га мае сучасную назву.

**1942** год — нарадзіўся (вёска Гірэвічы Валожынскі раён) Аркадзь Уладзіміравіч Русецкі, беларускі гісторык, культуролаг. Доктар гістарычных навук, прафесар. У 1995—1997 гадах — намеснік, першы намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама; у 1997—2009-м — рэктар Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. Аўтар шэрагу навучальных дапаможнікаў. А.У. Русецкі выбіраўся ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу, з'яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэатам прэміі імя У. Караткевіча, кавалерам ордэна «Знак Пашаны», медаля Францыска Скарыны, мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі».

### Было сказана

**Алесь ЗВОНАК, паэт:**
*«Той яснасць вока й думкі зберажэ*
*Каму ў жыцці зазнаць прыпала многа».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Мужчыны! Не ўпусціце момант: у халады так лёгка адрозніць разумную жанчыну ад дурніцы.**

**Разумная — у шапцы, дурніца — з прычоскай.**

Калі чалавек у рэкламе ўстае з ложка, бадзёра збіраецца і ідзе на работу, унізе экрана павінен быць надпіс: не спрабуйце гэта паўтарыць, трук выкананы дасведчаным прафесіяналам!

**Дзеці — кветкі жыцця :)**

**Ідзём з дачкой. Яна: «Насці — 3 гады, а мне ўжо 4, ха-ха-ха!»**

**Я: «А мне 28 гадоў, ха-ха!»**

**Малая: «28 гадоў, матуля, — гэта ўжо не ха-ха-ха, а ого-го!»**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4284.

Нумар падпісаны ў 19.30 31 кастрычніка 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12